**Сёння мы працягваем сумесны праект з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у рамках тэматычнай старонкі "Мае фінансы...", які, спадзяёмся, стане вашай асабістай скарбонкай карысных ведаў у галіне фінансаў. Ведаў, якія дапамогуць планаваць, захоўваць і папаўняць уласны бюджэт, і адначасова якія можна (і трэба!) перадаваць сваім вучням.**

## Сённяшняя тэма "Як спланаваць уласны бюджэт?".

**З нядаўняга часу па суседстве з рэдакцыяй размясцілася невялікая фірма з інтрыгуючым заклікам "Грошы за гадзіну" — без даведак і лішніх пытанняў там абацаюць выдаць неабходную суму грошай "да зарплаты". Зразумела, пад працэнты. Прафесійная цікаўнасць не дазволіла прайсці міма і не пацікавіцца: што за "шчодрыя" бізнесмены там размясціліся, калі паток кліентаў да іх павялічваецца з кожным днём. На справе ўсё аказалася не так прыцягальна, як у рэкламе. На першы погляд невялікія працэнты ў пераразліку на гадавыя даходзяць да 1000! І замест невялікай сумы ў мільён рублёў, якой раптам не хапіла да зарплаты, даўжнік можа аказацца вінаваты дзясяткі, а то і сотні мільёнаў рублёў. І тым не менш жадаючых пазычыць "да зарплаты" не становіцца менш. Гэтак жа як і тых, хто з часам з жахам даведваецца пра памеры сум, неабходных да вяртання. Пазбегнуць такіх сітуацый і наогул неабходнасці пазычаць грошы дапаможа граматнае планаванне ўласнага бюджэту. Як звесці даходы з расходамі, як забяспечыць фінансавую стабільнасць сям'і, расказвае Юлія Вячаславаўна САКОВІЧ, начальнік аддзела фінансавай граматнасці насельніцтва Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.**

# "Мех з грашыма", ці Як звесці даходы з расходамі?



Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, даходы сярэдняй беларускай сям'і ў першым квартале бягучага года складалі 7,3 млн рублёў у месяц, расходы — 5,3 млн рублёў. Пры гэтым у структуры спажывецкіх расходаў хатніх гаспадарак доля расходаў на харчаванне склала 41,4%, на пакупку нехарчовых тавараў — 35,2%, на аплату паслуг — 21,0%.

Але гэта, як кажуць, сярэдняя тэмпература па бальніцы. Сярод абследаваных гаспадарак ёсць і тыя, якія маюць рэсурсы ў памеры менш за 1 млн на чалавека, і тыя, хто мае больш за 5 млн на чалавека ў сям'і. Так, згодна з прадстаўленымі статыстычнымі данымі, 11,6% са 100 абследаваных гаспадарак маюць 1,5-2 млн рублёў на чалавека, 15,6% — 2-2,5 млн, ад 3 да 3,5 млн рублёў на чалавека прыходзіцца ў 13,8% з абследаваных гаспадарак. Паказчык жа больш чым у 5 млн рублёў на чалавека адзначаецца ў 13% гаспадарак.

Зрэшты, як сцвярджаюць фінансісты, далёка не заўсёды вялікія даходы гарантуюць стабільнае фінансавае становішча сям'і. У любым акружэнні знойдуцца людзі, якія выдатна ўкладваюцца ў сярэднестатыстычны беларускі бюджэт, а ёсць і тыя, якія ледзьве не штомесяц вымушаны звяртацца па пазыкі, маючы значна большыя рэсурсы. Справа — ва ўменні планаваць свой уласны бюджэт.

— Слова "бюджэт" мы чуем ледзь не кожны дзень. Што гэта такое? Слова "бюджэт" мае старанармандскае паходжанне і даслоўна азначае кашалёк, сумку, скураны мяшок, мех з грашыма, — расказвае Юлія Вячаславаўна Саковіч, начальнік аддзела фінансавай граматнасці насельніцтва Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. — Сёння ж пад паняцце "бюджэт" прынята атаясамліваць са схемай даходаў і выдаткаў пэўнай асобы (сям'і, бізнесу, арганізацыі, дзяржавы і г.д.), якая ўстанаўліваецца на пэўны перыяд часу. Бюджэт уяўляе сабой сукупнасць планаваных даходаў і выдаткаў. У Бюджэтным кодэксе Рэспублікі Беларусь пад бюджэтам разумеюць план фарміравання і выкарыстання грашовых сродкаў для забеспячэння рэалізацыі задач і функцый дзяржавы. Пры гэтым любы бюджэт складаецца на пэўны перыяд часу і мае свае мэты і задачы. Планаванне бывае кароткатэрміновым (як правіла, на месяц) і доўгатэрміновым (звыш аднаго месяца). У залежнасці ад мэт мы можам складаць бюджэт на самыя розныя тэрміны (тыдзень, месяц, квартал, паўгоддзе, год, некалькі гадоў). Калі мы хочам ацаніць свой бюджэт на месяц, то дастаткова скласці бюджэт толькі на гэты тэрмін. Калі мы плануем пакупку дарагой тэхнікі, адпачынак ці дарагія падарункі, то тэрмін планавання будзе даўжэйшым.

Да мэт складання бюджэту адносяць супастаўленне даходаў і расходаў, аптымізацыю выдаткаў, дасягненне пастаяннага дастатку, вылучэнне мэтавага фінансавання і г.д.

— У залежнасці ад віду бюджэту ён можа быць асабістым, сямейным, дзяржаўным, бюджэтам арганізацыі і г.д., — працягвае Юлія Вячаславаўна Саковіч. — Адразу хачу ўнесці розніцу ў паняцці "асабісты бюджэт" і "сямейны бюджэт". Асабісты бюджэт — бюджэт аднаго чалавека, сямейны — сям'і. Складанне сямейнага бюджэту аб'яднаўчае сям'ю, робіць кожнага яе члена адказным за прыняцце сумесных рашэнняў па выкарыстанні наяўных грашовых сродкаў.

Галоўнае ў гэтым працэсе — супастаўленне даходаў і расходаў. І вось тут найчасцей і ўзнікаюць праблемы.

— Пры супастаўленні даходаў і выдаткаў можа быць некалькі варыянтаў. Першы — даходы меншыя за выдаткі. Гэта сведчыць пра тое, што існуе дэфіцыт бюджэту, гэта значыць грошай недастаткова для пакрыцця існуючых выдаткаў. Для таго каб бюджэт стаў збалансаваным, неабходна альбо павялічыць даходы, альбо паменшыць выдаткі, — расказвае Юлія Вячаславаўна. — Наступны варыянт, пры якім даходы большыя за выдаткі, кажа пра тое, што існуе прафіцыт бюджэту, гэта значыць грошай дастаткова. У гэтай сітуацыі неабходна задумацца пра тое, як больш эфектыўна выкарыстоўваць лішак грошай. Ну і нарэшце варыянт, пры якім даходы роўныя расходам. Гэта сведчыць пра тое, што бюджэт збалансаваны. Аднак вонкавы баланс не заўсёды азначае баланс яго ўнутранага боку.

Што маецца на ўвазе? Гаворка ідзе пра абавязковыя і неабавязковыя траты. Так, да даходаў адносяцца ўсе крыніцы паступлення сродкаў. Іх умоўна можна падзяліць на пастаянныя і часовыя. Да пастаянных даходаў адносяцца заработная плата, прэмія, стыпендыя, працэнты па банкаўскіх укладах і іншыя. Да часовых — тыя даходы, якія вы не атрымліваеце кожны месяц, — гэта можа быць квартальная прэмія, прэмія па выніках працы, грошы, атрыманыя за рэалізацыю гароднiны з прысядзібнага ўчастка, аплата працы школьнікаў летам і г.д. З другога боку, да расходаў адносяцца тыя выдаткі, якія мы ажыццяўляем. Выдаткі бываюць абавязковымі (неабходнымі) і неабавязковымі. Да абавязковых (неабходных) адносяцца тыя выдаткі, якія задавальняюць надзённыя патрэбы — гэта плата за камунальныя паслугі, выдаткі на харчаванне, адзенне, тэлефон, транспарт. Да неабавязковых адносяць выдаткі, звязаныя з задавальненнем імгненных жаданняў, — тое, што вы хочаце купіць, але ад набыцця чаго можаце адмовіцца ў любы момант. Тут можна заўважыць, што неабавязковыя выдаткі могуць быць стымулам да зберажэння.

— Таму, калі ўсе прыбыткі ўлічаны і выдаткі носяць толькі абавязковы характар, такі збалансаваны бюджэт мы называем правільным, — адзначае спецыяліст. — А калі ў выдатках ёсць неабавязковыя траты, а даходы роўныя расходам, то бюджэт збалансаваны няправільна. Такім чынам, правільны збалансаваны бюджэт — гэта мэта асабістага (сямейнага) планавання даходаў і выдаткаў.

Падрыхтавала Алена МАРКЕВІЧ.
markevich@ng-press.by

## Як скласці бюджэт на месяц?

***1. Неабходна вызначыць, якія даходы ёсць у сям'і, гэта значыць тыя сродкі, якія маюцца ў вашым распараджэнні ці будуць мецца. Напрыклад, зарплата, даходы ад укладаў і г.д.***

***2. Варта распісаць і ўлічыць усе выдаткі, размеркаваўшы іх на абавязковыя (неабходныя) і неабавязковыя.***

***3. Наступны крок — супаставіць даходы і выдаткі. Калі даходаў больш, чым выдаткаў, то гэта значыць, што вы на правільным шляху і можаце выкарыстоўваць гэтую розніцу на датэрміновае пагашэнне крэдыту, на доўгатэрміновае планаванне, зберажэнні. Калі расходаў больш, чым даходаў, то неабходна старанна ацаніць свае неабавязковыя выдаткі і па максімуме скарацiць іх, каб даходы зраўняліся з выдаткамі. І ў далейшым неабходна строга кантраляваць свае даходы і выдаткі.***

***Для складання бюджэту на больш доўгі тэрмін патрабуецца ўлічыць яшчэ такія фактары, як эканамічная сітуацыя ў краіне, інфляцыя. Складанне сямейнага бюджэту і яго выкананне прывядзе да эканоміі пэўнай колькасці грошай, якія пасля будуць неабходныя для рэалізацыі жыццёвых мэт. Міжнародныя спецыялісты раяць 5—10% ад даходу адкладаць, фарміруючы тым самым падушку бяспекі сям'і. У кожнай сям'і падушка бяспекі павінна складаць 3-4 штомесячныя бюджэты. Бо заўсёды ёсць незапланаваныя выдаткі. У сярэднім збалансаваны бюджэт сям'і выглядае наступным чынам:***

***— 50—60% — абавязковыя плацяжы, пакупка рэчаў, неабходных для жыцця;***

***— 20—30% — забавы, падарожжы, адпачынак;***

***— 10—20% — зберажэнні (рэзервовы фонд; сродкі для далейшага інвеставання; назапашванне пэўнай сумы на якую-небудзь глабальную куплю; пенсійныя зберажэнні і інш.).***

## ДАРЭЧЫ

***Да нядаўняга часу памочнікам у складанні бюджэту сям'і служылі толькі папера, ручка ды калькулятар. І разбіваць аркуш паперы на неабходныя слупкі, вычэрчваць табліцы ды ўносіць запісы на пастаяннай аснове доўгі час, як таго патрабуе складанне бюджэту, маглі толькі самыя цярплівыя людзі. Да таго ж з пашырэннем трат, развіццём крэдытавання складаць уручную такія табліцы было ўсё больш складана. Напэўна, менавіта таму і сталі з'яўляцца электронныя памочнікі — спецыяльныя праграмныя прадукты пад агульнай назвай "дамашняя бухгалтэрыя". Сёння на рынку іх вельмі шмат — ад самых простых да звышскладаных і мудрагелістых. З дапамогай першых магчыма проста ўлічваць даходы і расходы па пэўных катэгорыях. Больш складаныя праграмныя прадукты ў рэжыме анлайн могуць адсочваць паступленні сродкаў, іх спісанне, нагадваць аб неабходных выплатах і г.д.***

***У цэлым большая частка праграм для дамашняй бухгалтэрыі дазваляе складаць па шаблонах розныя спісы, рахункі, катэгорыі даходаў — зарплата, атрыманне арэнднай платы, дывідэндаў, а таксама расходаў — камунальныя плацяжы, кватэрная плата, харчаванне, прадметы гігіены, сувязь і г.д.***

***Дарэчы, аналіз гэтых даных часам выкрывае вельмі цікавыя рэчы, напрыклад такія, што значная частка расходаў — гэта зусім неабавязковыя траты на "невялічкія" прысмакі. А таксама выяўляецца, што перанос гэтых выдаткаў у катэгорыю "зберажэнні" дазваляе ажыццявіць даўнюю мару аб пэўнай пакупцы ці адпачынку.***